МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УПОЛНОМОЧЕННЫЙ ПО ДЕЛАМ РЕЛИГИЙ
И НАЦИОНАЛЬНОСТЕЙ

Учреждение образования
«МОГИЛЕВСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
им. А.А. КУЛЕШОВА»

КАФЕДРА ФИЛОСОФИИ

# РЕЛИГИЯ И ОБЩЕСТВО – 3: АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СОВРЕМЕННОГО РЕЛИГИОВЕДЕНИЯ

СБОРНИК НАУЧНЫХ ТРУДОВ

Под общей редакцией
В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко

Могилев 2008

Репозиторий БарГУ

УДК 2(075.8)
ББК 86я73
Р36

*Печатается по решению редакционно-издательского совета
УО «МГУ им. А.А. Кулешова»*

**Редакционная коллегия:**
*С.М. Бычок*, кандидат исторических наук, доцент;
*А.А. Воробьев*, кандидат исторических наук, доцент; *О.В. Дьяченко*, кандидат философских наук, доцент; *И.А. Марзалюк*, доктор исторических наук, доцент; *Н.М. Пурышева*, кандидат исторических наук, доцент; *Я.Г. Риер*, доктор исторических наук, профессор;
*В.В. Старостенко*, кандидат философских наук, доцент

**Рецензенты:**
доктор социологических наук профессор *Ю.М. Бубнов;*
доктор философских наук профессор *Т.П. Короткая*;
доктор исторических наук профессор *В.С.Кошелев*

Р36 **Религия и общество – 3**: актуальные проблемы современного религиоведения : сб. науч. трудов / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2008. – 328 с.: ил.

ISBN 978-985-480-477-4.

В сборник включены материалы научных трудов участников Международной научно-практической конференции «Религия и общество – 3: актуальные проблемы современного религиоведения», проведенной в МГУ им. А.А. Кулешова 14 мая 2008 года.

Публикуемые материалы отражают многообразие точек зрения по актуальным проблемам религиоведения – истории, философии и социологии религии, свободы совести и государственно-конфесссиональных отношений; религии, культуры и образования. Ряд статей публикуется в порядке дискуссии.

**УДК 2(075.8)**
**ББК 86я73**

Научное издание

**РЕЛИГИЯ И ОБЩЕСТВО – 3: АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СОВРЕМЕННОГО РЕЛИГИОВЕДЕНИЯ**

СБОРНИК НАУЧНЫХ ТРУДОВ

Технический редактор *А.Н. Гладун* Компьютерная верстка *А.Л. Позняков*

Подписано в печать 21.07.2008. Формат 60x84/16
Гарнитура Arial Cyr. Усл.-печ. л. 19,1.
Уч.-изд. л. 29,9. Тираж 150 экз. Заказ № 315.

Учреждение образования "Могилевский государственный университет им. А.А. Кулешова", 212022, Могилев, Космонавтов, 1.
ЛИ № 02330/278 от 30.04.2004 г.

Отпечатано на ризографе отдела оперативной полиграфии
УО «МГУ им. А.А. Кулешова». 212022, Могилев, Космонавтов, 1.

**ISBN 978-985-480-477-4**

© Оформление. УО «МГУ им. А.А.Кулешова», 2008

Репозиторий БарГУ

# ПРАВОСЛАВИЕ В СОЦИОКУЛЬТУРНОЙ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ

УДК 94(476)

**Л.С. Адзінец, А.У. Літвінскі**
*(г. Баранавічы, Беларусь)*

## ГЕОРГІЙ КАНІСКІ – ЗМАГАР ЗА ЗАХАВАННЕ І АДРАДЖЭННЕ ПРАВАСЛАЎЯ НА БЕЛАРУСІ

У жніўні 2008 г. адзначаецца 15-годдзе кананізацыі славутага ўкраінскага і беларускага праваслаўнага дзеяча XVIII ст. Георгія Каніскага [5, с. 85]. Ён вядомы як асветнік, палеміст, драматург. Але ўсё ж можна з упэўненасцю сцвярджаць, што дамінантай яго дзейнасці была барацьба за захаванне і адраджэнне праваслаўя на Беларусі.

Весці гэтую барацьбу ў канкрэтна-гістарычных умовах, што склаліся на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у апошні перыяд яе існавання, было вельмі няпроста. Кіруючыя колы "дзяржавы абодвух народаў" глядзелі на праваслаўных вельмі падазрона, лічачы іх непажаданым элементам у грамадскай структуры. Падтрымку праваслаўнай царкве на тэрыторыі Рэчы Паспалітай аказваў афіцыйны Пецярбург, аднак дадзеная падтрымка магла скампраметаваць царкву, паколькі тыя, хто настойваў на жорсткай пазіцыі ў адносінах да дысідэнтаў, гэтую самую падтрымку выкарыстоўвалі ў якасці антыправаслаўнага аргумента.

У сувязі з гэтым не трэба здзіўляцца таму, што ў пачатку другой паловы XVIII ст. на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай існавала толькі адна праваслаўная епархія – Беларуская, з цэнтрам у Магілёве. "Маглі вы яшчэ бачыць у ёй нейкую колькасць цэркваў праваслаўных, але і тыя на пуні і хлеўнікі падобны, а не на храмы хрысціянскія", – адзначаў у адной са сваіх пропаведзяў Г. Каніскі [1, с. 203].

У такіх умовах ад Георгія Каніскага, які ў 1755 г. заняў епіскапскую кафедру ў Магілёве, патрабаваліся настойлівасць і энергічнасць у спалучэнні з вытрымкай і тактоўнасцю. Ён імкнуўся заручыцца падтрымкай апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, дамогся ў таго аўдыенцыі і быў блізкі да поспеху, паколькі ў 1765 г. кароль абяцаў вярнуць праваслаўным іх правы, культавыя і манастырскія будынкі. Падчас аўдыенцыі магілёўскі епіскап выступіў з пераканаўчай прамовай у абарону не толькі праваслаўных, але і іншых дысідэнтаў. Гэтая прамова, перакладзеная на шэраг еўрапейскіх моў, разглядалася ў свай час як выдатны ўзор абароны верацярпімасці [5, с. 85].

Аднак Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, які фактычна ўсё сваё жыццё паміж некім і нечым вагаўся, не стрымаў слова [4, с. 144]. Больш за тое, узнікла непасрэдная пагроза жыццю епіскапа, і ён у 1768 г. вымушаны быў эміграваць у Расію [5, с. 85]. Каталіцкія колы Рэчы Паспалітай не маглі дараваць



Рэпазіторый БарДУ

іерарху актыўнай ролі ў дзейнасці Слуцкай канфедэрацыі (вядома, што Г. Каніскі быў запрошаны для складання яе Акта і прызначаны членам шматбаковага суда паміж праваслаўнымі, католікамі і уніятамі) [2, с. 24].

Такім чынам, спроба Г. Каніскага знайсці кампраміс з уладамі Рэчы Паспалітай скончылася няўдачай. Аднак у сваёй дзейнасці па адраджэнні праваслаўя магілёўскі епіскап выкарыстоўваў не толькі палітычныя сродкі. Выпускнік, а потым выкладчык і рэктар Кіева-Магілянскай акадэміі, ён вялікую увагу ўдзяляў справе асветы праваслаўнага люду. У 1757 г. Г. Каніскі звярнуўся з граматай да беларускага праваслаўнага духавенства, у якой пераконваў, што навучаць народ ёсць найпершая і галоўная справа пастырская, бо без навучання не будзе веры [1, с. 203].

Стан праваслаўнай адукацыі ў той час быў бядотным, што, на думку Г. Каніскага, тлумачылася фактычнай забаронай праваслаўным мець свае школы і семінарыі, "... а таму не толькі ніжэйшага саслоўя людзі, але і само дваранства у крайняй прастаце і невуцтве вымушана быць" [1, с. 203]. Гэта, між іншым, істотна зніжала канкурэнтаздольнасць праваслаўя ў ідэйнай барацьбе з іншымі канфесіямі. Дадзены факт выдатна ўсведамляў Г. Каніскі. У пісьме да архімандрыта Данскога ён з сумам адзначаў, што сустракаўся з многімі праваслаўнымі святарамі, якія ні на рускай, ні на польскай мове пісаць не ўмелі, а некаторыя з іх не ведалі нават колькасці запаведзяў і таінстваў [3, с. 32]. Зразумела, такое становішча было ненармальным.

Магілёўскі епіскап імкнуўся выправіць дадзенае становішча. Адным з мерапрыемстваў у гэтым накірунку было адкрыццё ў 1757 г. ў Магілёве сярэдняй праваслаўнай навучальнай рэлігійнай установы на ўзор Кіева-Магілянскай акадэміі – Магілёўскай духоўнай семінарыі [1, с. 203]. За год да гэтага ім былі адкрытыя пачатковыя класы семінарыі, у якіх вучні атрымлівалі элементарныя веды катэхетычнага характару.Важнай падзеяй таго ж, вельмі плённага ў жыцці Г. Каніскага, 1757 г., было заснаванне пры магілёўскім архірэйскім доме друкарні і перавыданне скарочанага тэкста "Катэхізіса" Феафана Пракаповіча у перакладзе самаго Г. Каніскага на "рускі дыялект" [4, с. 144].

Спрыяльныя ўмовы для дзейнасці Г. Каніскага склаліся з 1772 г., калі Усходняя Беларусь разам з Магілёвам увайшла ў склад Расійскай імперыі, у якой праваслаўе мела статус дзяржаўнай рэлігіі. Можна зразумець іерарха, калі ён загадаў напісаць на надмагіллі, што 17 гадоў змагаўся з ваўкамі, а 22 гады правёў у спакоі з авечкамі [2, с. 94]. Аднак не такім ужо бестурботным было жыццё кіраўніка Магілёўскай епархіі пад расійскім скіпетрам. З моманта вяртання епіскапа на кафедру ў Магілёў у 1772 г. важнейшым накірункам яго дзейнасці стала павелічэнне колькасці праваслаўных за кошт уніяцкага насельніцтва. Адразу пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. епіскап Георгій звярнуўся да імператрыцы Кацярыны II з просьбай аб пераводзе уніятаў у праваслаўе. Ужо 9 кастрычніка 1772 г. Г. Каніскі паведаміў Свяцейшаму Сіноду аб тым, што уніяцкія святары і цэлыя прыходы просяць прыняць іх у праваслаўе. За 1772 – 1775 гг. у яго сабралася 35 такіх прашэнняў [3, с. 6]. У 1781 г. ён паведаміў аб далучэнні да праваслаўя звыш 85 тыс. прыхаджан [3, с. 6].

Асоба Г. Каніскага цікавая яшчэ і тым, што захаванню непарушнай вернасці праваслаўнай традыцыі спрыялі яго публічныя прамовы і царкоўныя



Репозиторий БарГУ

пропаведзі. Усяго ім складзена каля 80 (апублікавана 78) прамоў і пропаведзяў (слоў) [1, с. 202-203]. Ён аўтар гістарычных запісак пра Магілёўскую епархію. Г. Каніскі таксама збіраў дакументы па гісторыі праваслаўнай царквы (каралеўскія граматы і інш.) [4, с. 145].

Такім чынам, шматгранная дзейнасць Георгія Каніскага спрыяла захаванню і адраджэнню праваслаўнай царквы на землях Беларусі. Дзякуючы яго намаганням Беларуская епархія з цэнтрам у Магілёве ператварылася ў апору праваслаўя.

**Літаратура**


1. Асветнікі зямлі Беларускай: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш.; маст. У.М. Жук. – Мінск: БелЭн, 2001. – 496 с.
2. Грыгаровіч, І.І. Беларуская епархія / І.І. Грыгаровіч. – Мінск : БелЭн, 1992. – 102 с.
3. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX стст.) В.В. Грыгор'ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі, А.М. Філатава; навук. рэд. У.І. Навіцкі. – Мінск: ВП "Экаперспектыва", 1998. – 340 с.
4. Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – 368 с.
5. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1997. – Т. 4. – 432 с.


УДК 348.71

**Г.И. Близнец** *(г. Гомель, Беларусь)*

## ВЛИЯНИЕ ПРИНЯТИЯ ХРИСТИАНСТВА НА ПОЛИТИКО-ПРАВОВУЮ КУЛЬТУРУ ДРЕВНЕЙ РУСИ

Образование государства у восточных славян сопровождалось появлением и развитием политико-правовой идеологии. Общепризнанным является тот факт, что принятие православного вероисповедания оказало решающее воздействие на развитие русской политико-правовой культуры. Переход Руси от язычества к христианству, совершенный в 988 г., можно назвать ключевым событием русской истории. Крещение Руси следует трактовать не только как политический маневр князя Владимира, стремившегося укрепить отношения между Русью и Византийской империей, но и как одну из попыток Владимира создать единую культуру Киевской Руси [1, с. 7].

Бесспорно, что христианство распространилось в Киеве задолго до Владимира. Бесспорно, что отношение к христианству князей и дружины менялось. Из договоров с греками видно, что при Игоре оно было сочувственным, а при Святославе равнодушным, но всегда терпимым.

Положение резко меняется при Владимире. За одно десятилетие он провел две конфессиональные реформы – сначала языческую, в 988 г. христианскую. Побуждения, надо полагать, оба раза были схожими: Владимир считал, что единению Руси может и должна соответствовать и способствовать единообразная культура, в тех условиях – единая вера. Рассказ летописи

Репозиторий БарГУ